# Беларуска-польскае супрацоўніцтва ў культуры

Сёлета 11 чэрвеня распачаўся першы этап чарговага, XXIV, курса Міжнароднай летняй школы «Нясвіжская акадэмія». Гэты курс прысвечаны тэме «Ахова і рэстаўрацыя помнікаў абарончай архітэктуры», яго тэарэтыка-практычны этап пройдзе з 11 па 23 чэрвеня 2018 года ў Рэспубліцы Беларусь. Другі этап – стажыроўка і абарона выпускных работ адбудзецца ў Рэспубліцы Польшча ў жніўні наступнага года.

«Нясвіжская акадэмія» – гэта сумесны культурна-адукацыйны праект дзвюх суседніх краінаў, Беларусі і Польшчы, які курыруюць два міністэрствы культуры. Разлічаны ён на спецыялістаў у галіне рэстаўрацыі помнікаў культуры краінаў Усходняй Еўропы.

Гэтым разам слухачамі акадэміі былі залічаныя спецыялісты з Беларусі, Украіны, Літвы – усяго 15 чалавек (за гады існавання «Нясвіжскай акадэміі» атрымалі яе міжнародны сертыфікат больш за 200 беларускіх спецыялістаў).

На адкрыцці XXIV курса акадэміі прысутнічалі і павіншавалі яе слухачоў з пачаткам вучобы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Аляксандр Яцко, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аліна Корбут, другі сакратар Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Эльжбета Інеўска, ініцыятар стварэння «Нясвіжскай акадэміі», галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты» Уладзімір Гілеп.

*Наш кар.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ